**Людміла Шклёда**

## КВІТНЕЙ, МАЁ ПАЛЕССЕ!

*Не мае лепш, здаецца,*
*Тых хваляў з траў і ніў.*
*Радзімаю завецца*
*Куток, што так зрадніў.*

*Прысяду я на ўзлессі:*
*Тут з кветак дываны.*
*І часта на Палессі*
*Свой гімн пяюць званы.*

*Квітней, маё Палессе,*
*Мой, любы сэрцу край!*
*Паклон хай б'е калоссе...*
*Сіл, моцы набірай!*

*Люблю твае прасторы:*
*Лясы, палі, лугі...*
*Тут з рэк, азёр узоры.*
*Не трэба мне другі.*

*З паклонам я звярнуся*
*Да зорак, да крыніц:*
*«Свой край любіць клянуся,*
*Край вечных таямніц!»*

*Навокал так прыгожа:*
*Прырода, родны кут...*
*Гучаць, як рэха, можа:*
*«Мой лёс і шчасце тут!»*